View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk

brought to you by CORE

provided by Belarusian State Pedagogical University Repository

# Дыктант як від практыкавання: навучальны каменціраваны дыктант

Каменціраваны дыктант – гэта такі від навучальнага дыктанта, пры якім запіс слоў або сказаў суправаджаецца тлумачэннем арфаграм або пунктаграм, г. зн. адбываецца непасрэдна ў час напісання слоў, спалучэнняў слоў, сказаў. Арфаграфічны разбор слова або пунктуацыйны разбор сказа, які праводзіцца адначасова з напісаннем, патрабуе ад навучэнцаў пэўных практычных уменняў, таму такі тып дыктанта з’яўляецца даволі складаным. У школьнай практыцы каменціраваны дыктант можна выкарыстоўваць на любым этапе ўрока (у час праверкі дамашняга задання, пры замацаванні новага матэрыялу, пры абагульненні і паўтарэнні раней вывучанага і інш.). У вышэйшых навучальных установах такі від практыкуецца, як правіла, на этапе сістэматызацыі і абагульнення ведаў, уменняў і навыкаў. Каменціраваны дыктант можа быць як зрокавым, так і слыхавым.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1. Спішыце тэкст, каменціруючы правапіс прапушчаных арфаграм і пастаноўку знакаў прыпынку.

Не/рухома стаяў густы ам…рцвелы лес шчыльна прытуліўшы верхавіны да верхавін пераплёўшы галіны акрыўшыся белымі шатамі крохкай, шапаткой шэрані. Ні звер ні чалавек ні птушка не парушалі яго ранішняга зімняга спакою. Толькі дзесь у гушчары галін суха палуск(ава, ва)ў мароз пераскокваючы з дрэва на дрэва. Пачынала святлець. З мроку вырысоўваліся стромкія камлі ялін каржакаватыя дубы шурпатыя крывыя бярозы а паміж іх выступалі як пачварныя дзяды зломаныя бураю высокія ра…шчэпл…ныя абломкі дрэў і спілованыя пні з белымі круглымі шапкамі з завостранымі вярхамі ды белымі капцамі ра…кідаліся па лесе прыгожа скругл…ныя снежныя курганкі. Працяты марозам снег хрустка скрыпеў пад нагамі дзеда Талаша і грамознага Мартына Рыля. Ішлі яны не спяшаючыся выбіраючы найболей глухія л…сныя дарожкі і сце…кі абыходзячы небяспечныя мясціны. Ішлі моўчкі ўглыбіўшыся ў свае самотныя думкі.

Дзед Талаш чалавек пераважна замкнуты. Сваімі думкамі не з кожным падзеліцца і думае іх спакваля грунтоўна асабліва калі справа ходзіць аб важных рэчах і планы свае выношвае доўга. Але ўжо калі на што наважыцца то не а…ступіцца покі не/дойдзе свайго.

Якуб Колас. “Дрыгва”.

* Падбярыце сінонімы да слоў *грамозны*, *самотны*. Растлумачце значэнне слова *капец*.

2. Запішыце тэкст пад дыктоўку, каменціруючы правапіс асобных (падкрэсленых) арфаграм і пастаноўку знакаў прыпынку.

Бярлога была прасторная і ўтульная. Хапала цёплага моху, сухога лісця. Уверсе было багата пераплеценага карэння ад паваленага дрэва, так што столь была добрая, шчыльная, ніколі не__прапускала дажджу. Бярлога была ў дзікім гушчарніку, ніхто не парушаў спакою, хаця і праходзіла недалёка лясная дарога, але была яна глухой і непраездджай. Колькі разоў выбіралася мядзведзіца з Мішкам [медзведзяня] на гэтую дарогу, каб пагрэцца на сонцы, і ніколі не_сустракалі тут чалавека. Маці адпачывала, а Мішку не было ніякай ахвоты да сну. Ён каторы раз ужо абследаваў бярлогу, абнюхваў кожны каменьчык, кожны корань. Праўда, цікавага ў гэтым было мала. І калі ўсё гэта надакучыла Мішку, ён выбраўся з бярлогі на волю. Там было весялей. Добра было пакуляцца ў верасках, пабегаць сярод папараці, пастаяць перад мурашнікам і, запусціўшы ў яго лапу, разварушыўшы, хуценька адскочыць убок і пазіраць, як бегаюць неўгамонныя мурашы, цягаюць сцяблінкі, перацягваюць белыя яечкі. Багата чаго ёсць у лесе і паглядзець, паслухаць.

Міхась Лынькоў. "Пра смелага ваяку Мішку і яго слаўных таварышаў".

* Растлумачце значэнне слова *глухая* (дарога). Падбярыце да тэксту загаловак.

3. Спішыце тэкст, каменціруючы правапіс прапушчаных арфаграм і пастаноўку знакаў прыпынку.

Першы раз на вёсцы Алесь не заўважыў як прыходзіла вясна. А некалі памятае ён востра а…чуваў раннія подыхі яе яшчэ тады калі ледз… прыкметна звінелі капяжы са страхі і нават заўважаў як пачыналі мяняцца вераб…іныя галасы на сметніку.

Раней ён пазнаваў голас вясны тады калі вакол ляжалі і рэзалі вочы сваёй б…лізной снягі і раптам а/поўдні капяжы са стрэх падалі так што гук іх нагад(ыва, ва)ў ба…злівы грукат падарожніка які ўжо з…явіўся але яшчэ баіцца галасна сказаць аб сваім прыходзе. З нізін, з/пад возера, Алесь прыносіў дамоў галінкі вярбы іх слабы і тонкі пах  жыў асобна не/хочучы зліваццa са звыклымі пахамі хаты а пупырышкі якія распускаліся нагад(ыва,ва)лі яму маленькіх гусянят якія плывуць адно за адным па летняй вадзе. Ён ладзіў млыны на першай ручаіне якая бегла з/пад белага снегу чыстая і празрыстая потым калі адтайвалі ўзгоркі вечарамі раптам пазнаваў як востра і па/свойму пахне гліна. Вясна! Адзіная вечная кніга якую чытаюць ад нараджэння да самай смерці не/адчуваючы смутку і ра…чаравання…

Пятрусь Броўка. "Калі зліваюцца рэкі".

* Патлумачце выраз *рэзаць вочы*. Вызначце, да якога тыпу маўлення належыць тэкст.

4. Запішыце тэкст пад дыктоўку, каменціруючы правапіс асобных (падкрэсленых) арфаграм і  пастаноўку знакаў прыпынку.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Ёсць на свеце гарады, імя якіх для твайго вуха проста сугучча. Прагучала назва, скалыхнула паветра і знікла назаўсёды ці да наступнага разу, бо нічога за гэтай назвай для цябе не стаіць. Не чуў, не бываў. А і не буду – невялікая страта.

А ёсць гарады, звязаныя з табою нябачнай повяззю, самой музыкай свайго імя, або нечым трывалым, што вяжа з імі назаўсёды, нават супраць твайго жадання. Ёсць для мяне некалькі такіх гарадоў на Беларусі. І адзін з іх – горад маёй маці, Мсціслаў. Тут яна нарадзілася амаль дзевяноста год таму назад і тут пражыла некалькі першых сваіх месяцаў. І Мсціслаў быў для мяне, з гэтай прычыны, і не свой, і нібыта крыху свой.

Гарады, як некаторыя людзі, чакаюць свайго адкрыцця табой. Шмат год праходзіў міма чалавека – і раптам раскрываецца ён табе ў адной размове і на ўсё жыццё.

Уладзімір Караткевіч. "Дыяментавы горад".

* Падбярыце сінонімы да слова *повязь*.

5. Спішыце тэкст, каменціруючы правапіс прапушчаных арфаграм і пастаноўку знакаў прыпынку.

Любоў да (Р, р)адзімы мае перадумовай веданне мінулага свайго народа – яго перамог і паражэнняў здабыткаў і страт яго г…рояў мысліцеляў вялікіх майстроў помнікаў духоўнай і матэры…льнай культуры.

Памяць патрабуе клопату. Гэта тым больш тычыцца мінуўшчыны беларускага народа які так часта апынаўся пад смерчам вае(н, нн)ых дзеянняў і цярпеў незаме(н, нн)ыя страты людзей каштоўнасцей духоўных скарбаў.

Любоў да (Р, р)адзімы не з…яўляецца аднак вынікам атрыманых ведаў; хутчэй імкненне да ведаў ёсць вынік любові да (Р, р)адзімы. Менавіта любоўю да (Р, р)адзімы дыктуецца жаданне прасякаць загадкі даўніны давед(ыва, ва)цца пра тое што было але чаго ўжо няма ці што засталося мала/прыкметнымі слядамі ў скупых словах летапісаў і не/шматлікіх дакументаў што зацерлася гужам стаго(дз, ддз)яў зацягнулася глухімі туманамі мінулых эпох.

Цікавас…ць да даўніны мае духоўны характар яна караніцца ў сутнасці чалавека жыццё якога вельмі кароткае але чый розум жадае агарнуць неахопны час зазірае ў будучыню і пранікае ў мінулае.

Кастусь Тарасаў. "Памяць пра легенды".

* Як вы разумееце выразы *прасякаць загадкі даўніны*, *гуж стагоддзяў*? Вызначце, да якога тыпу маўлення належыць тэкст.

6. Запішыце тэкст пад дыктоўку, каменціруючы правапіс асобных (падкрэсленых) арфаграм і пастаноўку знакаў прыпынку.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

А ці ведаеце вы такую дзівосную мясціну Налібоцкай пушчы, як возера Кромань? Калі ёсць край на зямлі, дык гэта тут, на замілаванай мясціне Прынёманскага краю. На шырокім рухомым люстэрку вады нараджаецца ранішняе сонейка. Яно – вялікая радасць для жывёл, раслін, і ўвогуле для ўсёй пушчы. Разумная вада плюскоча, хвалюецца, іскрыцца срабрыстымі зорачкамі, віхлястымі хвалямі ў зялёнай раме выносістых лясін і выпетранага чароту. Тут, у жыццядайнай цішыні вытканага з туману фрэскавага неба, на вашых вачах разам з берагам перакуліцца ў азёрную бездань цэлая флатылія белапенных аблачын.

Як дагістарычны дыназаўр, разваліўся ўздоўж берага каля самай вады кашлаты выварацень. Пачарнелыя ад часу крывулястыя ногі-сукі ўпіраюцца ў бурштынавае дно. Гарбатая спіна, пакрытая парэпанай скурай-карой, бы панцырам, адлівае халоднай сінечай, даўжэзны замшэлы хвост пахаджае на ветры. Глядзець страхоцце адно: здаецца, ён вось-вось накінецца на цябе. Напэўна, ён выйшаў з каменнага веку і застыў у чаканні сваіх суродзічаў!

Ласкавы праменьчык зазірнуў мне ў вочы, абдаў прыемным цяплом, падняў настрой. Насупроць мяне, на затравелай выспе, п'ючы сонейка, групуюцца мае сябры: з белымі зграбнымі ножкамі танкастволыя бярозкі-падлеткі, прыземістыя ў зялёных сарафанах ялінкі.

– Ах, якое хараство! Райскі кут!

Мікола Бусько. "Райскі кут".

* Патлумачце значэнне слоў *выносісты*, *выпетраны*, *бурштынавы*. Падбярыце сінонім да слова *выспа*.

7. Спішыце тэкст, каменціруючы правапіс прапушчаных арфаграм і пастаноўку знакаў прыпынку.

Дзе яшчэ, як (не, ні) у вандроўцы, можна падзівіцца на кра…віды роднага краю! А колькі яшчэ ўсяго цікавага за межамі Беларусі! Пад/час вандровак сам таго не заўважаеш як вывучаеш ге…графію і мову. Як у кап'ют…рнай стратэгіі: а…крываеш для сябе новыя землі і гарады на практыцы а не з падручнікаў дазнаешся пра розныя дзівы пра не/паўторныя месцы заўважаеш асаблівасці мясцін адметнасць насельніцтва таго ці іншага рэгіёна прыкмячаеш не толькі розніцу ў мовах але ж нават і ў ды…лектах. Вяртаешся да/дому і гаворыш на такой дзіўнай сумесі гаворак што сябры калі пастараюцца змогуць вылічыць дзе вас увесь час насіла.

А з ге…графіяй усё прасцей: нават калі вы вывучылі ў школе дзе знаходзіцца тая ці іншая краіна які там клімат асаблівасці жыцця палітычнае становішча асноўныя гарады рэльеф і назвы рэк – усё/роўна пакуль там не пабываеш словы ў падручніку застаюцца словамі. Можна выдатна ведаць ге…графію але тым не менш падарожнік – практык а ге…граф застанецца тэарэтыкам. Гэта ўсё/роўна што быць доктарам і нікога не л…чыць.

Крысціна Карчэўская. "Аўтастоп, ці як вандраваць, не марнуючы грошай".

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

* Падбярыце сінонімы да слова *вандроўка*.

8. Запішыце тэкст пад дыктоўку, каменціруючы правапіс асобных (падкрэсленых) арфаграм і пастаноўку знакаў прыпынку.

…Разняволена і пакручаста, абягаючы ўзгорыстыя сасняки, раздзяляючы заліўныя лугі, плыве з вякоў няспешна Нёман. У яго затоках і завоінах, асмужаных аерам і асакой, шныпарадь серабрыстыя плоткі, тапырацца зялёна-чырвоныя, з сінім адлівам акуні, як падводная лодка, як нежывая здань, назіркам праплыве гарласты шчупак, сыта і цельпукавата прасунуцца ў прыцемку язі…

Антось ой як даўно ведаў кожны выгін і кожнае нёманскае калена. Яшчэ тады, калі сам ганяў плыты ў Коўна, бусаком перамераў усе бухты і водмелі, вывучыў нечаканыя вірластыя круцялі і ціхія завадзі. А тут, ля дому, дзе няма на вадзе месца, па якім не сцябала яго вуда валасянка, Антось мог без памылкі ўявіць усё гэтае падводнае царства. І хоць з году ў год рэчышча рабіла новыя выкрунтасы, наносіла пясчаныя грады, пакідала старыцы і адкрывала выдмы, падмывала і валіла на дно ўчэпістыя дубы, ён, вырываючыся прыхапкам ад сялянскай штодзённіцы, запамінаў гэтыя змены і бярог у памяці…

Алесь Камароўскі. “Бусел”.

* Патлумачце значэнні слоў *завоіна*, *назіркам, шныпарадь*, *тапырацца*, *цельпукавата*, *бусаком*, *вірласты*, *выкрунтасы*, *старыца*, *выдма*. Вызначце сферу ўжывання гэтых слоў.

9. Спішыце тэкст, каменціруючы правапіс прапушчаных арфаграм і пастаноўку знакаў прыпынку.

Іншы раз калі гартаеш кнігі па гісторыі Беларусі так хочацца за фактамі і датамі гістарычных падзей убачыць людзей пра якіх у летапісах або дакументах або м…награфіях напісана толькі некалькі радкоў даведацца пра тое як яны жылі чаму радаваліся і аб чым сумавалі прачытаць хоць адно моўл(ен, ян)ае імі слоўца пагглядзець на іх партрэты каб наблізіць да сябе той далёкі час і стаць све…кам усяму што не/калі адбывалася.

Нічога новага не а…крыю калі скажу што гісторыя гэта не/толькі даты падзей і ясныя, на па…ставе све…чаняў сучаснікаў факты (хаця іх, безумоўна, трэба ведаць, каб хтос…ці не сп…куляваў на гістарычнай не/адукаванасці народа) але і духоўны скарб які стаго(ддз, дз)ямі збіраўся народам і жывіць ягоную пам…ць абуджае нацы…нальную свядомасць. Гэта так/сама маральныя ўрокі што засцерагаюць нас ад паўтарэння памылак. Гэта і запавет любіць і шанаваць сваю (Б,б)ацькаўшчыну запавет перададзены нам бацькамі і дзядамі.

Вітаўт Чаропка. “Імя ў летапісе”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

* Патлумачце значэнне слова *м...награфія*. Вызначце, да якога тыпу маўлення і стылю належыць тэкст. Абгрунтуйце вывад.

10. Запішыце тэкст пад дыктоўку, каменціруючы правапіс асобных (падкрэсленых) арфаграм і пастаноўку знакаў прыпынку.

У Малым Сяле, дзе ў крайняй хаце ад лесу жыве Дзімка, няма рэчкі. Укруга вёскі цягнуцца засмужаныя сухадолы, гразкія балотцы і камяністыя пагоркі. На сухадолах грыўкамі стаіць бярэзнік, за гразкія імшэчкі і ператочыны ўчэпіста трымаецца шэры алешнік, а на пясчаных выдмах, апрача сіўцу, лебяды і конскага шчаўя, нічога болей не расце.

Напэўна, сотні гадоў жывуць тут людзі – выкошваюць у лагчынах марную траву, пасуць на няўдобіцы статак, але ім, здаецца, і гора мала, што ў Малым Сяле няма рэчкі. А хлопцам нельга без вады. Няма рэчкі, і няма вясёлых забаў, няма разгону, а ў самую спёку хоць і праўда ў ночвах купайся. Сорамна прызнацца, але Дзімка рачнога шчупака толькі на малюнку бачыў.

Прырода моцна, бессардэчна пакрыўдзіла маласельцаў. Як быццам у насмешку, яна прыстаралася для іх нешырокую, звілістую канаву, што паціху струменіцца паўз Дзімкаву хату, цячэ цераз балоцісты поплаў і губляецца ў змрочным алешніку. Дзесьці там, далёка, яна ўпадае ў Цну. Несправядліва ўсё ж: каму – Цна, а каму – гэтая мізэрная канава, у якой вада заўсёды пратухлая, іржавая, з каляровымі скалкамі.

Дзімка сумаваў па рэчцы, зайздросціў дзецям, якія нарадзіліся каля вялікай вады.

Віктар Гардзей. “Каламутная вада”.

* Растлумачце значэнні слоў *сухадол*, *ператочына*, *выдма*, *ночвы*, *няўдобіца*, *поплаў*, *скалка*. Падбярыце сінонімы да слова *марная* (трава).

11. Спішыце тэкст, каменціруючы правапіс прапушчаных арфаграм і пастаноўку знакаў прыпынку.

Прыгад(ыва, ва)ю Хойнікі пары свайго маленства і юна...тва калі пад рослымі таполямі ўсця... галоўнай ...уліцы хадзіў з першым здзіўленнем ад вялікага паселішча і мно...тва сустрэчных не/знаёмых людзей. Першыя купле(н, нн)ыя ў кнігарні на раг... ...уліцы мастацкія кнігі з вабным свежым пахам друкарскай фарбы. Сцены драўля(н, нн)ага будынка р...дакцыі куды патаемна/жадана хацелася зазірнуць пабачыць як робіцца газета дзе быў ужо зме...чаны і мой першы верш.

Памятаю да драбніц той красавіцкі сонечны дзень калі мая класная аб н...чым па/змоўніцк... пашапталася з мамай на ...уліцы; потым у ма...чыным гаро...чыку дзе капаў грады з не/малым хваляваннем паведамілі мне што званілі з р...дакцыі прасілі заўтра прыехаць. Мама глянула спагаднымі вачамі класная падбадзёрыла: калі клічуць значыць упадабалі вершы едзь смела.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Не/вельмі смела аднак пераступаў я парог хойні...кай раёнкі. Потым ужо часта бываючы тут і нават з паў/года працуючы ў студэн...кім а...пачынку прыгад(ыва, ва)ў багата/астылае ўжо сваё колішняе хваляванне бо зна...шоў у р...дакцыі сапраўдных сяброў, першых літаратурных настаўнікаў.

Мікола Мятліцкі. “Цяпло буслінага крыла”.

* Вызначце стыль і тып тэксту. Звярніце ўвагу на прыметнік *красавіцкі* (дзень). Чаму, на ваш погляд, беларускі мовазнаўца Фёдар Янкоўскі называў назвы месяцаў “гаваркімі” словамі? Патлумачце сваё разуменне назвы *красавік*.

12. Запішыце тэкст пад дыктоўку, каменціруючы правапіс асобных (падкрэсленых) арфаграм і пастаноўку знакаў прыпынку.

У французскай сталіцы, якая ўжо тады грымела сваімі навуковымі і педагагічнымі поспехамі на кантыненце, Ігнат Дамейка час дарэмна не марнаваў. Ужо сталы чалавек, ён нарэшце вызначыўся ў практычным жыцці. У Сарбонскім універсітэце, Каледжы дэ Франс, тамтэйшым батанічным садзе, адным з найлепшых і найбагацейшых у Еўропе, ён паглыбляе свае веды па фізіцы і хіміі, матэматыцы і батаніцы, геалогіі і мінералогіі – якраз тых навуках, да якіх меў не толькі схільнасці, але і захапленне. Але мала і гэтага яму, Ігнату Іпалітавічу: у жніўні тысяча восемсот трыццаць чацвёртага года ён паступае ў Горную школу ў Парыжы і менш чым праз тры гады атрымлівае дыплом інжынера горнай справы.

Яшчэ там, у Парыжы, Ігнат Дамейка падпісвае рабочы кантракт. Умова нумар адзін: на працягу шасці гадоў стварыць хімічную лабараторыю і падрыхтаваць спецыялістаў па хіміі ў чылійскім горадзе Какімба. Шукальнік свайго месца ў жыцці, Богам надзелены адкрывальнік тайнаў Зямлі, Дамейка займеў магчымасць праверыць сябе на практыцы.

Анатоль Мяснікоў. “Незапатрабаваны Бацькаўшчынай беларус”.

* Падбярыце да тэксту загаловак. Назавіце сінонімы і антонімы да слоў *сталы, захапленне*.

13. Спішыце тэкст, каменціруючы правапіс прапушчаных арфаграм і пастаноўку знакаў прыпынку.

Бадзёрым ядра(н, нн)ым жнівен...скім ранкам бег я на (Ц, ц)нянскае ...озера. Рабіць гэтую прабе...ку ўдаецца (не, ня)/часта: у Мінску бываю летам рэ...ка. ...уліцу подбегам перасек на пераходзе/зебры выбраўся на сце...ку між дамамі і тут спыніўся: каля тарцовай сцяны шэрага дзев...ці/павярховага гмаха расцвілі мальвы – чырвоныя ружовыя жоўтыя белыя. Кветкі густа стаялі па края... шырокай гра...кі на якой лапушылася бульба.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

З/за ...угла суседняга шэрага дзев...ці/павярховіка выбл...снула сонца. Мутна/ружовае але ўжо цёплае яно заліло промнямі гра...ку – успыхнулі кроплі расы на шырозным лісц... мальвы, буйныя зоркі/кветкі засв...ціліся мокрымі пялёсткамі.

Маланкай выбл...снуў успамін з далёкага маленства ў нашым п...лісадніку каля тарцовай сцяны новай хаты якую збудавалі ў тысяч... дзевяц...сот сорак шостым годзе бо старую спалілі немцы калі ўцякалі з Прыбясе(дз, ддз)я раслі вяргіні і мальвы. В...ргіняў было два куст...: на адным кветкі цёмна/чырвоныя а на другім – жоўтыя круглыя быццам сонечныя шарыкі. А між гэтымі кустамі высіліся тонкія сцяблінкі мальваў на якіх красаваліся быццам прыклее(н, нн)ыя ружовыя кветкі.

Леанід Левановіч. “Свята мальвы”.

* Патлумачце значэнні слоў *ядра(н, нн)ы, тарцовы, лапушыцца*. Знайдзіце ў тэксце словы, ужытыя ў пераносным значэнні.

14. Запішыце тэкст пад дыктоўку, каменціруючы правапіс асобных (падкрэсленых) арфаграм і пастаноўку знакаў прыпынку.

Андрэй Макаёнак быў вельмі людскім чалавекам. Пра яго таварыскасць, альтруізм складзена нямала легендаў. Прырода шчодра і ўсебакова адарыла яго: ён добра маляваў, быў адмысловым разьбяром па дрэве, меў не абы-якія акцёрскія здольнасці. Ён жыве ва ўдзячнай памяці шматлікіх сваякоў, сяброў ды знаёмых, у цёпла-захопленых згадках пра вясёлыя гісторыі-прыгоды, выдумляць якія ён і ўмеў, і любіў...

Зыходзячы з вопыту пастаноўкі п’ес, Андрэй Макаёнак сфармуляваў для сябе некалькі драматургічных правілаў: інтрыга павінна быць вострай, займальнай; дзеянне – дынамічным; нельга спадзявацца толькі на сітуацыю; у аснове калізій – праўда. Як бачым, нічога звышнатуральнага, сакрэтнага ў гэтых правілах няма. Драматург эмпірычным шляхам дайшоў да ўсведамлення асноўных законаў драматургічнага жанру, і асабліва перспектыўным аказалася ўсведамленне пісьменнікам важнасці эстэтычнай місіі драматычнага характару. Бяда ўсіх твораў, напісаных па канонах бесканфліктнай літаратуры, заключаўся менавіта ў тым, што ў іх ігнараваўся мастацкі характар і замест паўнакроўнага, жыццёва_верагоднага характару манціраваўся муляж рознай ступені праўдападобнасці. Таму Андрэй Макаёнак стаў надаваць асноўнае значэнне псіхалагічнай распрацоўцы персанажаў, іх моўнай характарыстыцы.

Сцяпан Лаўшук. “На творчай арбіце Андрэя Макаёнка”.

* Падбярыце да тэксту загаловак. Патлумачце значэнні слоў *альтруізм, эмпірычны*.

15. Спішыце тэкст, каменціруючы правапіс прапушчаных арфаграм і пастаноўку знакаў прыпынку.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Надвор...е і сапраўды ўсталявалася цудоўнае якое звычайна бывае ў гэтую пару і дзень выдаўся пагодны цёплы. Паветра чыс...юткае і празрыстае хоць і лётаюць у ім (з, зз)яючы на сонцы тонкія па...уцінкі. Яны ...сюды на пожнях лугах і агародах сумна дзівяць чалавечае вока сваім бл...скам. Н... хмаркі н... аблачынкі н... ветрык... а па...уцінкі лётаюць пераносячы на сваіх нітачках плоймы дробных па...учкоў. Відаць здалёк як прыбраліся ў бар...овыя і жоўтыя колеры зарэчныя ляс... зазелянела вераснёвая рунь. Ля дарогі красавалася некалькі арабін а паміж рэ...кага лісц... віселі як дзявочыя за...ушніцы даспелыя гронкі ягад.

Час здавалася прыпыніў сваю хаду а свет нібы пашыры...ся: бачна ва ўсе б...кі. Прасторна мусіць ад таго што ўсё сабралі скасілі а...церабілі. З неба на якім пачалі ўжо з...яўляцца рэ...кія белыя аблачыны на ўвесь гэты свет задумліва пазірала ласкавае ужо крыху асты...ае сонца.

Уладзімір Гніламёдаў. “Валошкі на мяжы”.

* Вызначце стыль і тып тэксту. Абгрунтуйце адказ. Знайдзіце ўжытыя ў тэксце метафары.

16. Запішыце пад дыктоўку, каменціруючы правапіс асобных (падкрэсленых) арфаграм.

Падпісаць, абрэзаць, адкапаць, перадсвяточны, надрэзаць, разнесці, расклеіць, узвесці, ускласці, бяздонны, бессардэчны, прэм’ер-міністр, школа-інтэрнат, экс-чэмпіён, віцэ-прэзідэнт, Бялыніцкі-Біруля, паўслоіка, паў-Мінска, іншамоўны, пяціпавярховы, добразычлівы, урачыста_вымаўлены, беларуска-рускі, музычна-філалагічны, бледна-зялёны, цёмна-блакітны, паўднёва-заходні, дацямна, злева, збольшага, упустую, навошта, затым, за_ тым лесам, гэтаксама, надвае, насцеж, якраз, па-твойму, па-трэцяе, калі-нікалі, абы-дзе, усё_роўна, як_след, чытаў_жа, напісаў-такі, нелюдзімы, непрачытаны тэкст, не_прачытаны ўчора раздзел.

* Складзіце словазлучэнні з 4 словамі (на выбар). Падбярыце антонімы да слоў і спалучэнняў слоў *адкапаць*, *злева*, *як след*.

17. Спішыце словы (спалучэнні слоў, словазлучэнні), каменціруючы правапіс прапушчаных арфаграм.

А…скочыць, на…бавіць, па…сохлы, (з,с)берагчы, (з,с)пусцелы, ра(з,с)сыпаць, ра(з,с)квечаны, штаб/афіцэр, тэлефон/аўтамат, мала/эфектыўны, добра/угноены, буда/кашалёўскі, празрыста/ружовы, іван/мележаўскі, кісла/салодкі, хто/ніхто, за/летась, па/роўну, з/усім, з/усім класам, што/дзень, у/двух, у/адно, да/шчэнту, на/ніз, усё/адно, у/даль, па/воўчы, раз/пораз, абы/дзе, толькі/што, даволі/такі, чытала/ж, абы/хто, абы/з/кім, н(я, е)/вольнік, не/абходны, не/жаданне, не/узараныя палеткі, не/закончанае на занятках практыкаванне, не/дабор, не/дасаліць, не/дапісаць

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

да канца артыкул, лекцыя не/закончана, не/мой, а твой, не/варта, не/супраць, ні/кудышны, ні/сцюжа, ні/у/кога.

* Складзіце 2 сказы так, каб у адным ужывалася слова *зусім*, у другім – словазлучэнне *з усім класам*. Падбярыце сінонімы да слова *н(я, е)/вольнік*.

**Даведка**

1. Нерухома стаяў густы амярцвелы лес, шчыльна прытуліўшы верхавіны да верхавін, пераплёўшы галіны, акрыўшыся белымі шатамі крохкай, шапаткой шэрані. Ні звер, ні чалавек, ні птушка не парушалі яго ранішняга зімняга спакою. Толькі дзесь у гушчары галін суха палусквая мароз, пераскокваючы з дрэва на дрэва. Пачынала святлець. З мроку вырысоўваліся стромкія камлі ялін, каржакаватыя дубы, шурпатыя крывыя бярозы, а паміж іх выступалі, як пачварныя дзяды, зламаныя бураю высокія расшчэпленыя абломкі дрэў і спілованыя пні з белымі круглымі шапкамі, з завостранымі вярхамі, ды белымі капцамі раскідаліся па лесе прыгожа скругленыя снежныя курганкі. Праццяты марозам снег хрустка скрыпеў пад нагамі дзеда Талаша і грамознага Мартына Рыля. Ішлі яны не спяшаючыся, выбіраючы найболей глухія лясныя дарожкі і сцежкі, абыходзячы небяспечныя мясціны. Ішлі моўчкі, углыбіўшыся ў свае самотныя думкі.

Дзед Талаш – чалавек пераважна замкнуты. Сваімі думкамі не з кожным падзеліцца і думае іх спакваля, грунтоўна, асабліва калі справа ходзіць аб важных рэчах, і планы свае выношвае доўга. Але ўжо калі на што наважыцца, то не адступіцца, покі не дойдзе свайго.

Якуб Колас. “Дрыгва”.

3. Першы раз на вёсцы Алесь не заўважыў, як прыходзіла вясна. А некалі, памятае, ён востра адчуваў раннія подыхі яе яшчэ тады, калі ледзь прыкметна звінелі капяжы са страхі, і нават заўважаў, як пачыналі мяняцца вераб’іныя галасы на сметніку.

Раней ён пазнаваў голас вясны тады, калі вакол ляжалі і рэзалі вочы сваёй белізной снягі і раптам, апоўдні, капяжы са стрэх падалі так, што гук іх нагадваў баязлівы грукат падарожніка, які ўжо з’явіўся, але яшчэ баіцца голасна сказаць аб сваім прыходзе. З нізін, з-пад возера, Алесь прыносіў дамоў, галінкі вярбы – іх слабы і тонкі пах жыў асобна, не хочучы зліваца са звыклымі пахамі хаты, а пупырышкі, якія распускаліся, нагадвалі яму маленькіх гусянят, якія плывуць адно за адным па летняй вадзе. Ён ладзіў млыны на першай ручаіне, якая бегла з-пад белага снегу чыстая і празрыстая, потым, калі адтайвалі ўзгоркі, вечарамі раптам пазнаваў, як востра і па-свойму пахне гліна. Вясна! Адзіная вечная кніга, якую чытаюць ад нараджэння да самай смерці, не адчуваючы смутку і расчаравання…

Пятрусь Броўка. “Калі зліваюцца рэкі”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

5. Любоў да Радзімы мае перадумовай веданне мінулага свайго народа – яго перамог і паражэнняў, здабыткаў і страт, яго герояў, мысліцеляў, вялікіх майстроў, помнікаў духоўнай і матэрыяльнай культуры.

Памяць патрабуе клопату. Гэта тым больш тычыцца мінуўшчыны беларускага народа, які так часта апынаўся пад смерчам ваенных дзеянняў і цярпеў незаменныя страты людзей, каштоўнасцей, духоўных скарбаў.

Любоў да Радзімы не з'яўляецца аднак вынікам атрыманых ведаў; хутчэй імкненне да ведаў ёсць вынік любові да Радзімы. Менавіта любоўю да Радзімы дыктуецца жаданне прасякаць загадкі даўніны даведвацца пра тое, што было, але чаго ўжо няма ці што засталося малапрыкметнымі слядамі ў скупых словах летапісаў і нешматлікіх дакументаў, што зацерлася гужам стагоддзяў, зацягнулася глухімі туманамі мінулых эпох.

Цікавасць да даўніны мае духоўны характар, яна караніцца ў сутнасці чалавека, жыццё якога вельмі кароткае, але чый розум жадае агарнуць неахопны час, зазірае ў будучыню і пранікае ў мінулае.

Кастусь Тарасаў. "Памяць пра легенды".

7. Дзе яшчэ, як не ў вандроўцы, можна падзівіцца на краявіды роднага краю! А колькі яшчэ ўсяго цікавага за межамі Беларусі! Падчас вандровак сам таго не заўважаеш, як вывучаеш геаграфію і мову. Як у кап'ютарнай стратэгіі: адкрываеш для сябе новыя землі і гарады на практыцы, а не з падручнікаў, дазнаешся пра розныя дзівы, пра непаўторныя месцы, заўважаеш асаблівасці мясцін, адметнасць насельніцтва таго ці іншага рэгіёна, прыкмячаеш не толькі розніцу ў мовах, але ж нават і ў дыялектах. Вяртаешся дадому – і гаворыш на такой дзіўнай сумесі гаворак, што сябры, калі пастараюцца, змогуць вылічыць, дзе вас увесь час насіла.

А з геаграфіяй усё прасцей: нават калі вы вывучылі ў школе, дзе знаходзіцца тая ці іншая краіна, які там клімат, асаблівасці жыцця, палітычнае становішча, асноўныя гарады, рэльеф і назвы рэк, – усё роўна, пакуль там не пабываеш, словы ў падручніку застаюцца словамі. Можна выдатна ведаць геаграфію, але тым не менш падарожнік – практык, а географ застанецца тэарэтыкам. Гэта ўсё роўна, што быць доктарам і нікога не лячыць.

Крысціна Карчэўская. "Аўтастоп, ці як вандраваць, не марнуючы грошай".

9. Іншы раз, калі гартаеш кнігі па гісторыі Беларусі, так хочацца за фактамі і датамі гістарычных падзей убачыць людзей, пра якіх у летапісах, або дакументах, або манаграфіях напісана толькі некалькі радкоў, даведацца пра тое, як яны жылі, чаму радаваліся і аб чым сумавалі, прачытаць хоць адно моўленае імі слоўца, паглядзець на іх партрэты, каб наблізіць да сябе той далёкі час і стаць сведкам усяму, што некалі адбывалася.

Нічога новага не адкрыю, калі скажу, што гісторыя – гэта не толькі даты падзей і ясныя, на падставе сведчанняў сучаснікаў факты (хаця іх, безумоўна, трэба ведаць, каб хтосьці не спекуляваў на гістарычнай неадукаванасці народа), але і духоўны скарб, які стагоддзямі збіраўся

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

народам і жывіць ягоную памяць, абуджае нацыянальную свядомасць. Гэта таксама маральныя ўрокі, што засцерагаюць нас ад паўтарэння памылак. Гэта і запавет любіць і шанаваць сваю Бацькаўшчыну, запавет, перададзены нам бацькамі і дзядамі.

Вітаўт Чаропка. “Імя ў летапісе”.

11. Прыгадваю Хойнікі пары свайго маленства і юнацтва, калі пад рослымі таполямі ўсцяж галоўнай вуліцы хадзіў з першым здзіўленнем ад вялікага паселішча і мноства сустрэчных незнаёмых людзей. Першыя купленыя ў кнігарні на рагу вуліцы мастацкія кнігі з вабным свежым пахам друкарскай фарбы. Сцены драўлянага будынка рэдакцыі, куды патаемна-жадана хацелася зазірнуць, пабачыць, як робіцца газета, дзе быў ужо змешчаны і мой першы верш.

Памятаю да драбніц той красавіцкі сонечны дзень, калі мая класная аб нечым па-змоўніцку пашапталася з мамай на вуліцы; потым у матчыным гародчыку, дзе капаў грады, з немалым хваляваннем паведамілі мне, што званілі з рэдакцыі, прасілі заўтра прыехаць. Мама глянула спагаднымі вачамі, класная падбадзёрыла: калі клічуць, значыць, упадабалі вершы, едзь смела.

Не вельмі смела, аднак, пераступаў я парог хойніцкай раёнкі. Потым ужо, часта бываючы тут і нават з паўгода працуючы ў студэнцкім адпачынку, прыгадваў багата астылае ўжо сваё колішняе хваляванне, бо знайшоў у рэдакцыі сапраўдных сяброў, першых літаратурных настаўнікаў.

Мікола Мятліцкі. “Цяпло буслінага крыла”.

13. Бадзёрым ядраным жнівеньскім ранкам бег я на Цнянскае возера. Рабіць гэтую прабежку ўдаецца нячаста: у Мінску бываю летам рэдка. Вуліцу подбегам перасек на пераходзе-зебры, выбраўся на сцежку між дамамі і тут спыніўся: каля тарцовай сцяны шэрага дзевяціпавярховага гмаха расцвілі мальвы – чырвоныя, ружовыя, жоўтыя, белыя. Кветкі густа стаялі па краях шырокай градкі, на якой лапушылася бульба.

З-за вугла суседняга шэрага дзевяціпавярховіка выбліснула сонца. Мутна-ружовае, але ўжо цёплае, яно заліло промнямі градку – успыхнулі кроплі расы на шырозным лісці мальвы, буйныя зоркі-кветкі засвяціліся мокрымі пялёсткамі.

Маланкай выбліснуў успамін з далёкага маленства: у нашым палісадніку каля тарцовай сцяны новай хаты, якую збудавалі ў тысяча дзевяцьсот сорак шостым годзе, бо старую спалілі немцы, калі ўцякалі з Прыбяседдзя, раслі вяргіні і мальвы. Вяргіняў было два кусты: на адным кветкі цёмна-чырвоныя, а на другім – жоўтыя, круглыя, быццам сонечныя шарыкі. А між гэтымі кустамі высіліся тонкія сцяблінкі мальваў, на якіх красаваліся, быццам прыклееныя, ружовыя кветкі.

Леанід Левановіч. “Свята мальвы”.

15. Надвор’е і сапраўды ўсталявалася цудоўнае, якое звычайна бывае ў гэтую пару, і дзень выдаўся пагодны, цёплы. Паветра чысцюткае і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

празрыстае, хоць і лётаюць у ім, ззяючы на сонцы, тонкія павуцінкі. Яны ўсюды – на пожнях, лугах і агародах – сумна дзівяць чалавечае вока сваім бляскам. Ні хмаркі, ні аблачынкі, ні ветрыку, а павуцінкі лётаюць, пераносячы на сваіх нітачках плоймы дробных павучкоў. Відаць здалёк, як прыбраліся ў барвовыя і жоўтыя колеры зарэчныя лясы, зазелянела вераснёвая рунь. Ля дарогі красавалася некалькі арабін, а паміж рэдкага лісця віселі, як дзявочыя завушніцы, даспелыя гронкі ягад.

Час, здавалася, прыпыніў сваю хаду, а свет нібы пашырыўся: бачна ва ўсе бакі. Прасторна, мусіць, ад таго, што ўсё сабралі, скасілі, абцерабілі. З неба, на якім пачалі ўжо з’яўляцца рэдкія белыя аблачыны, на ўвесь гэты свет задумліва пазірала ласкавае, ужо крыху астылае сонца.

Уладзімір Гніламёдаў. “Валошкі на мяжы”.

17. Адскочыць, надбавіць, падсохлы, зберагчы, спусцелы, рассыпаць, расквечаны, штаб-афіцэр, тэлефон-аўтамат, малаэфектыўны, добра ўгноены, буда-кашалёўскі, празрыста-ружовы, іванмележаўскі, кісла-салодкі, хто-ніхто, залетась, пароўну, зусім, з усім класам, штодзень, удвух, у адно, дашчэнту, наніз, усё адно, у даль, па-воўчы, раз-пораз, абы-дзе, толькі што, даволі-такі, чытала ж, абы-хто, абы з кім, нявольнік, неабходны, нежаданне, неўзараныя палеткі, не закончанае на занятках практыкаванне, недабор, недасаліць, не дапісаць да канца артыкул, лекцыя не закончана, не мой, а твой, не варта, не супраць, нікудышны, ні сцюжа, ні ў кога.